УДК 7.071(476.5):75.04+929

# ГУЛЬНІ З ВОБРАЗАМІ Ў ТВОРАХ АЛЕГА КРОШКІНА: АД ІРОНІІ ДА ГРАТЭСКУ

**Цыбульскі М.Л.**
*Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава", Віцебск*

У артыкуле разглядаецца жыццё і творчасць вядомага беларускага мастака Алега Крошкіна (1950–2020). Прыгадваюцца асноўныя кампазіцыі, што былі створаны ім на розных этапах жыцця. Падрабязна аналізуюцца персанальныя выставы.

Цэнтральная ўвага нададзена творчым прыярытэтам і характару вобразнасці ў жывапісных творах А. Крошкіна. Калажнае мысленне, якое ці не з самага пачатку творчасці стала яскравай прыкметай яго творчасці, сваімі вытокамі мела зварот мастака да спадчыны авангарда першай паловы XX стагоддзя. Калаж для Алега Крошкіна на некалькі дзесяцігоддзяў становіцца асноўным прынцыпам рэпрэзентацыі мастацкіх вобразаў. Паэтыка паўсядзённасці вызначае фармат жанравых інтэрпрэтацый у творах мастака. У сюжэтных кампазіцыях штодзённасць набывае то пафасна ідылічны, рамантычны, то гратэскава-іранічны характар.

Іронія і гульня з'яўляюцца дзвюма канстытуяванымі катэгорыямі мастацкага свету А. Крошкіна на ўсім працягу яго творчага шляху. Таксама і цікавасць мастака да паэтыкі "гарадскога фальклору", і дыскурс наіўнасці застаюцца блізкімі мастаку на розных этапах творчасці. Сродкамі мастацкай выразнасці становяцца колер, рытмічная інтанацыя, тэмпаральнасць, фактурнасць і ў цэлым агульная архітэктоніка кампазіцыйнага і жывапіснага ладу карціны.

Колер у абстрактных кампазіцыях Крошкіна – медыятар эмацыянальнага і філасофскага адначасова. Безумоўна, у эмацыянальным уздзеянні колеру ў працах мастака вялікае значэнне мае рытм і характар каларыстычных спалучэнняў.

**Ключавыя словы:** Алег Крошкін, віцебская мастацкая школа, мастацтва XX стагоддзя, жывапіс, графіка, Віцебск, калажнае мысленне, іронія, гарадскі фальклор.

# GAMES WITH IMAGES IN THE WORKS OF OLEG KROSHKIN: FROM IRONY TO GROTESQUE

**Tsybulsky M.L.**
*Educational Establishment "Vitebsk State PM Masherov University", Vitebsk*

The article examines life and work of the famous Belarusian artist Oleg Kroshkin (1950–2020). The main compositions that were created at different periods of his life are recalled. Personal exhibitions are analyzed in detail.

The primary attention is paid to the creative priority and character of imagery in A. Kroshkin's paintings. Collage thinking, which almost from the very beginning of his creative path became a bright feature of his artistic style, had its origins in the artist's appeal to the legacy of the avant-garde of the first half of the twentieth century. For Oleg Kroshkin collage became the main principle of representation of artistic images for several decades. The poetics of everyday life determines the format of genre interpretations in the artist's works. In the plot compositions the everyday life acquires a pathetically idyllic, romantic or grotesque-ironic character.

Irony and play are the two constituent categories of A. Kroshkin's art world throughout his career. As well as the artist's interest in the poetics of "urban folklore", the discourse of naivety remains close to the artist at different periods of his career.

The means of artistic expression are color, rhythmic intonation, temporality, texture and the architecture of the compositional and pictorial image of the picture in general.

Color in Kroshkin's abstract compositions is a mediator of the emotional and the philosophical at the same time. Undoubtedly, rhythm and nature of color combinations are of great importance in the emotional impact of color in the artist's works.
**Key words:** Oleg Kroshkin, Vitebsk Art school, Art of the XX century, painting, graphics, Vitebsk, collage thinking, irony, urban folklore.